# Чамярыс Юлія Аляксандраўна



Нарадзілася ў г.Скідзель Гродзенскага раёна. Скончыла філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы па спецыяльнасці "Славянскія мовы і літарараратуры".

Вершы пра каханне на рускай мове пачала пісаць у студэнцкія гады. Праз доўгую паўзу (амаль у 20 гадоў) вярнулася да паэтычнай творчасці на беларускай мове. З'яўляецца аўтарам вершаў пра любоў да Радзімы, роднага горада, філасоўскіх разважанняў, апавяданняў. Любімыя пісьменнікі Юліі – Ніл Гілевіч, Кузьма Чорны, Уладзімір Караткевіч.

Юлія Чамярыс – шматдзетная маці, разам з мужам Рыгорам яны выхоўваюць два сыны і дачку. Жыве ў Гродна, працуе ў Гімназіі №6 імя Ф.Э.Дзяржынскага г.Гродно настаўнікам і загадчыкам бібліятэкі.

Юлія Аляксандраўна – кіраўнік праектаў "Тык-ток рэпетытар па беларускай мове" і "Старонкі памяці", якія неаднаразова станавіліся лаурэатамі абласных і рэспубліканскіх конкурсаў, аб праектах распавядалі газеты "Зорька", "Гродзенская праўда", тэлеканалы "Гродна +" і "Беларусь 4", сайт "БелТА".

З вершам "Сэрца Беларусі" Юлія Чамярыс дэбютавала ў V абласным фестывалі "Поэзия – души движенье", узнагароджана дыпломам II ступені. Апавяданне "Пасля наваальніцы" увайшло ў зборнік "Поле памяти" і надрукавана ў газеце "Літаратура і мастацтва", верш "Нам трэба толькі не забыць" апублікаваны ў зборніку паэзіі "Память огненных лет" , атрымаў дыплом II ступені на XIII Каложскіх абласных навукова-адукацыйных чытаннях.

У 2024 годзе Юлія разам з дачкой Дзіянай выдалі кнігу аб Вялікай Айчыннай вайне, напісаную дзедам Юліі Міціным Іванам Іванавічам, "Гартаючы старонкі памяці". Рукапіс гістарычнай аповесці праляжаў больш за 30 гадоў пасля смерці ветэрана. У 2022 годзе сям'я Чамярыс пачала працу па наборы тэксту рукапіса, сабрала інфармацыю пра аўтара і праз паўтара гады выдала кнігу.

**Сон дзяцінства**

Утульны горад, родны мой,
З прыгожай назвай – Скідзель,
Крыніца юнасці маёй,
Душы маёй збавіцель!

Я да яго прыйду ў сне –
Успамінаў, мар адзінстве,
Адзіны шанс ён для мяне
Патрапіць ў дзяцінства!

Там дом бацькоўскі, там сям'я,
Знаёмая сцяжынка,
Там адчуваю, нібы я
Маленькая дзяўчынка...

Гуляю ў лялькі, даміно,
Чакаю з працы маму,
Увечары глядзім кіно
І мульцікі таксама.

Там голас мамы, там цяпло
Зімой пад тоўстым пледам,
З бабулей мы глядзім ў акно,
Чытаем кніжкі з дзедам...

Там тата купіць, што хачу!
Там з мамай робім градкі,
Там я на ровары імчу
Па сцежцы без аглядкі.

З сяброўкамі бяжым хутчэй,
Мы на Скідлянку разам!
Парэчкі робяцца смачней,
Калі з куста адразу...

...У летуценні тым магу
Аблокаў дакрануцца...
Шкада, што гэта цудны сон...
У дзяцінства не вярнуцца...

## Сэрца Беларусі

Неверагодныя людзі, прырода,
Мова, якой я заўжды ганаруся,
Мудрасць, гісторыя, слава народа…
Усё гэта – сэрца маёй Беларусі!

Стужкі блакітныя рэчак імклівых…
У возера, нібы ў люстэрка, гляджуся,
І аксамітных лугоў пералівы,
Гэта ўсё – сэрца маёй Беларусі!

Восень фарбуе на жоўты прасторы…
Ціхім завулкам па бруку прайдуся,
Сотняй агнёў зіхаціць начны горад…
Гэта ўсё – сэрца маёй Беларусі!

Хай гэта сэрца не ведае болю,
Край беларускі, прайдзі ўсе нягоды!
Радуйся сонцу, як птушка на волі,
Будзь дыяментам у думках народа!



## Выпускнікам

Здаецца ўчора ўсё было: калыска,
Бразготкі, калыханкі, паўзункі…
У памяці маёй яшчэ так блізка
Твой першы крок без мамінай рукі…

Я памятаю, як ты ўсміхаўся,
Калі ўбачыў мора першы раз,
У садок дзіцячы нехаця збіраўся,
Ішоў з букетам кветак у першы клас.

Здаецца, учора ты вучыў урокі,
Але прамчалі школьныя гады,
У дарослае жыццё ты робіш крокі,
З дзяцінствам развітаўся назаўжды…

Здаецца, толькі ўчора нашы дзеці
У гімназію цягнулі рукзакі,
А сення ўжо гучыць званок апошні,
І гімназісты ўжо – выпускнікі!

Для нас, бацькоў, вы лепшыя ў свеце!
У мінулым кіньце недавер і страх,
У жыцця вышыні, вы, ляціце, дзеці!
Хай мары здзейсняцца! У добры шлях!

**Колеры лета**

Сёлета вельмі халоднае лета:
Дождж барабаніць, вятрыска лютуе.
Так не хапае нам яркага света,
Мы, быццам кветкі, па сонцы сумуем.

Раптам з дзяцінства прыпомню я лета,
Як пара дзён, усё яно пралятала,
Радасць мая запаўняла сусветы,
З колераў пацеркі ў памяць уплятала.

Жоўты яскравы, як у полі сланечнік,
Сіні як рэчка, паросшая цінай,
Колер чырвоны кісліць, як парэчка,
Ці ўспамінаецца спелай малінай.

У фіялетавым – водар лаванды,
У колеры белым – пялёсткі рамонкаў,
Дзецьмі хацелі аранжавай Фанты –
Пілі звычайна ж вадзічку з калонкі.

Усё наваколле ў зялёны адзета,
Сонечны ранак, як сябра, вітае,
Можа, таму падабаецца лета,
Што кожны колер у дзяцінства вяртае…



**Я люблю…**

Я люблю гэты край – ён прыгожы такі!
Промні сонца над жытнім прасторам,
Веліч лесу на беразе сіняй ракі
І лугі як зялёнае мора.

Я люблю спевы птушак у ранішні час,
Я люблю краявіды навокал,
Шэпат лісця, што так супакойвае нас,
Безліч колераў радуе вока!

Я люблю родны дом, майскі ў квецені сад
І знаёмую побач сцяжынку,
Толькі тут у думках можна вярнуцца назад,
Стаць на момант маленькай дзяўчынкай...

Я люблю тых, хто побач і ў сэрцы маім,
Хто чаруе мой слых роднай мовай,
Дабрыню хто расціць у шчырым сэрцы сваім,
І любоўю, цяплом поўніць словы.

Гэта ўсё, што мяне напаўняе жыццём,
Што мае робіць моцнымі крылы,
Бо любоў да Радзімы – маё пачуццё,
І яно набіраецца сілы!



# Раскоша

Грамадства ведае, як трэба жыць,
Што поспех – гэта ўласная кватэра,
Айфон апошні трэба нам набыць
І тэлевізар з паўсцяны размерам.

Машыну ўзяць з салону і зрабіць
У соцсетках блог, каб поспех быў відочны,
Сваё жыццё ў здымках там пасціць,
Ад модных брэндаў каб сляпіла вочы.

Але сапраўднае багацце ў тым,
Чаго не можам мы купіць за грошы,
Каб жыць не толькі поспехам адным,
Ісці за летуценнем – вось раскоша!

Каб на сям'ю застаўся вольны час,
А раніцай каб не грымеў будзільнік,
Спяшаўся каб дадому кожны з нас,
І радаваў не толькі халадзільнік.

Хапала каб здароўя на спортзал,
А матывацыі – пачаць навуку,
Каб мець свой погляд, хто б што не казаў,
І небам даны хтось трымаў за руку!



## Сябру

У мяне нібы вырвалі сэрца...
Ззяе дзірка маштабаў сусвету,
Успамінаў мне толькі не сцерці,
Так балюча кранаць памяць гэту.
Без цябе як мне жыць на планеце?
Чым прыкрыць тую пустку навокал?
Мае слёзы не высушыць вецер,
У маіх думках маркота глыбока...
Я дазволю сабе пабыць слабай,
Буду плакаць, ляжаць нерухома,
Заліваць з ранку каву за кавай
І хавацца ад позіркаў дома.
Упаду ў гэты сум, каб падняцца,
Буду жыць на ўсе сто – не пазнаеш,
І аднойчы пачну ўсміхацца
Там, дзе ты на вясёлцы чакаеш...



Мой крэатыў не стоміцца,
Маё жыцце – сюрпрыз,
Дазвольце пазнаёміцца,
Я Юля Чамярыс!

Без ветра спадарожнага
Лячу ўверх – не ў ніз,
Вы прозвішча запомніце –
Я Юля Чамярыс!

Не, я не супакоюся,
І гэта не капрыз,
Я пылам не пакроюся –
Я Юля Чамярыс!